Эфектыўнасць вытворчасці і занятасць насельніцтва — у прыярытэце

На сумесным пасяджэнні Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта і сесіі абласнога Савета дэпутатаў разгледжаны ключавыя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна ў 2019 годзе. Вызначаны прыярытэты эфектыўнага гаспадарання ўсіх галін вытворчасці.

Падчас разгляду асаблівая ўвага дэпутатамі і кіраўнікамі выканаўчай улады аддавалася пытанням занятасці і працаўладкавання грамадзян. **Намеснік старшыні аблвыканкама Андрэй КЛЕЦ** адзначыў, што на рабочыя месцы, створаныя за кошт новых вытворчасцяў плануецца ўладкаваць не менш за 6,3 тысячы чалавек. Новыя месцы работы жыхары абласнога цэнтра і раёнаў атрымаюць у тым ліку на дзеючых вытворчасцях. Але асаблівы акцэнт робіцца на развіццё малога бізнесу. У сферы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў вобласці будзе створана больш за 700 арганізацый. 380 з іх запланавана адкрыць у абласным цэнтры, у Баранавічах — 62, у Пінску — 53.

Па кожным раёне вызначаны паказчыкі прадукцыйнасці працы, экспарту тавараў і паслуг, а таксама прыцягнення замежных інвестыцый, валавой прадукцыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, будаўніча-мантажных работ, тавараабароту ў гандлі. Праграма работы ёсць, засталося яе зацвердзіць ва ўстаноўленым законам парадку і выконваць на кожным прадпрыемстве, на кожнай вытворчасці.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

РЫНАК ПРАЦЫ

Ці можа беспрацоўны стаць айцішнікам?

У Віцебскай вобласці 2179 беспрацоўных — сёлета іх на 40 % меней, чым летась. А вакансій прыкладна 6680 — на 55 % больш.

Адпаведныя заданні ўрада і аблвыканкама па працаўладкаванні выкананы амаль што на 100 %. Тых, каму дапамаглі знайсці сябе на рынку працы, — каля 19,3 тысячы чалавек. Гэта тыя, хто афіцыйна не стаў беспрацоўным, але трапіў пад скарачэнне ці страціў работу ў іншых выпадках.

Узровень сярэдняй зарплаты ў рэгіёне — 849 рублёў — на 19,4 % больш, у параўнанні з канцом мінулага года. У Віцебскай вобласці ўзровень беспрацоўя не вылучаецца на фоне іншых — 0,4 %. Аналагічны ўзровень напружанасці на рынку працы.

У глыбінцы па-ранейшаму вельмі запатрабаваныя трактарысты, аграномы, жывёлаводы, аператары машыннага даення. А таксама — леснікі і фельчары.

А ў цэлым па вобласці не хапае швачак, кіроўцаў, кухараў, зборшчыкаў абутку, фрэзероўшчыкаў, электраманцёраў па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання і гэтак далей.

Заробкі для некаторых дэфіцытных спецыялістаў годныя. Даяркам, напрыклад, прапануюць каля 1000 рублёў, кіроўцам нават 1200, заатэхнікам — каля 1,1 тысячы. Нават прыбіральшчыкам гатовыя плаціць каля 730 рублёў у месяц.

Канешне, не ўсюды, але, калі паспець заявіць пра сабе, возьмуць на работу.

Можна і падпрацаваць: на зборы камянёў, прыборцы тэрыторый і гэтак далей. Сёлета ўсяго каля чатырох тысяч чалавек бралі ўдзел у такіх так званых грамадскіх аплачваемых работах.

Дарэчы, афіцыйна беспрацоўным аўтарам тэкстаў могуць выдзеліць суму на набыццё абсталявання, арэнду памяшкання, аплату сувязі і гэтак далей. Сума, якую не трэба вяртаць, немалая — да 15 базавых велічынь (памер адной — 24,5 рубля). Але пералічаць грошы, калі будзе ўзгоднены бізнес-план, і атрымаецца рэальны вынік. У маім выпадку — артыкулы, якія надрукавалі б.

На жаль, курсаў на «біржы працы», каб ахвотных вучылі на айцішнікаў, на сёння няма. Але, калі чалавек недзе вывучыцца за свае грошы або самастойна асвоіць гэтую дзейнасць, па згаданай вышэй схеме дапамогуць стварыць рабочае месца.

Між іншым, ёсць прыклады, калі людзі з вышэйшай адукацыяй становяцца рамеснікамі. Напрыклад, адзін зарабляе на веніках!

А чаму б інтэлігенту не заняцца сельскім турызмам? Тым больш што падатак — базавая велічыня ў год.

Дарэчы, Віцебшчына лідзіруе па перасяленні сем'яў у сельскую мясцовасць. Сёлета — больш за 40 сем'яў. А за апошнія пяць гадоў вяскоўцамі сталі больш за 1000 чалавек.

Як той казаў, чалавеку ініцыятыўнаму можна заняцца і бізнесам. У вобласці нямала магчымасцяў у рамках розных праектаў нават бясплатна навучыцца азам прадпрымальніцтва. Сёлета 170 чалавек, у асноўным з вышэйшай адукацыяй, распачалі сваю справу.

Камітэт па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва Віцебскага аблвыканкама спрыяе ўладкаванню на работу некаторых катэгорый грамадзян з дадатковымі гарантыямі занятасці.

Напрыклад, для тых, хто вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі, — бронь на прадпрыемствах. Сярод ільготнікаў і былыя выпускнікі, якім трэба даць першае рабочае месца...

Камітэтам фінансуецца стварэнне рабочых месцаў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. На адным з прадпрыемстваў пабываў аўтар гэтых радкоў.

Дырэктар вытворчага ўнітарнага прадпрыемства грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства глухіх» Аляксандр КАНАНЕНКА расказаў, што тут працуе каля 170 чалавек. Вырабляюць мяккую і корпусную мэблю, пасцельную бялізну, спецадзенне. У асартыменце прадукцыі нават шнуркі для канькоў хакеістаў розных колераў і мадэляў.

Паказаў абсталяванне, якое набылі пры падтрымцы камітэта па працы. Працуюць у здаровых канкурэнтных умовах: выйграюць тэндары на пастаўку мэблі.

Сярэдні заробак на прадпрыемстве 522 рублі. Плюс налічаецца пенсія па інваліднасці. У адрозненне ад людзей з абмежаванымі магчымасцямі, ёсць такія, хто з-за сваёй ляноты працаваць не жадае. На Віцебшчыне тых, хто нідзе афіцыйна не працуе, пры гэтым не інваліды і не беспрацоўныя, каля 74 тысяч чалавек.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ГРОШЫ,

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ расказаў пра тое, як заканадаўцы забяспечваюць умовы для развіцця эканомікі.

— Уладзімір Іванавіч, якія прыярытэты ў рабоце камісіі былі ў 2018 годзе?

— Работа не толькі Пастаяннай камісіі, але ўсёй верхняй палаты парламента сёлета была накіравана на фарміраванне заканадаўчай базы для рэалізацыі прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, ухваленых дэлегатамі пятага Усебеларускага народнага сходу — інвестыцыі, занятасць, экспарт, інфарматызацыя, моладзь. Як бачыце, чатыры з пяці датычацца сферы эканомікі.

— Інвестыцыям былі прысвечаны нядаўнія парламенцкія слуханні.

— Верхняя палата сфармулявала канкрэтныя прапановы па ўдасканаленні заканадаўства ў інвестыцыйнай сферы і прадставіла іх у Палату прадстаўнікоў, ва ўрад і Адміністрацыю Прэзідэнта. Гэта і развіццё інстытута спецінвесткантрактаў, і ўвядзенне стабілізацыйнай агаворкі (нераспаўсюджванне на інвестараў нормаў, якія пагаршаюць умовы іх працы), і развіццё прававых умоў для рынку аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, і распаўсюджванне ў іншых сектарах эканомікі паспяховай мадэлі «адна станцыя». Калі, як гэта зроблена ў Беларуска-кітайскім індустрыяльным парку, увесь комплекс паслуг для інвестара аказваецца на адной тэрыторыі, а для замежных інвестараў, якія пастаўляюць найноўшыя тэхналогіі і абсталяванне, прадугледжаны льготы. Інвестыцыі непасрэдным чынам звязаны з тэмай занятасці насельніцтва. Бо гэта — новыя рабочыя месцы, добрыя заробкі, у рэшце рэшт — дабрабыт людзей.

Пытанням занятасці насельніцтва было прысвечана выязное пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі ў Магілёве вясной. Па яго выніках мясцовай уладзе даручаны шэраг захадаў па павышэнні эканамічнага патэнцыялу рэгіёнаў.

Гэта работа была працягнутая ў ліпені, калі на круглым стале ў Віцебску абмяркоўвалася практыка выкарыстання закона «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва». У Мінэканомікі былі накіраваны рэкамендацыі па ўдасканаленні заканадаўства і, у прыватнасці, праекта ўказа «Аб дзяржаўнай фінансавай падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва».

— Чым адметная работа заканадаўцаў па падтрымцы экспарту?

— Наша місія — фарміраванне прававых умоў для падтрымкі прадпрыемстваў-экспарцёраў. Асноўная прапанова сенатараў — актыўнае стымуляванне экспарту высокатэхналагічнай прадукцыі і комплексная падтрымка «на знешнім контуры» інавацыйна актыўных прадпрыемстваў.

У чэрвені Пастаянная камісія па эканоміцы, бюджэце і фінансах правяла пашыранае пасяджэнне на базе ААТ «Магатэкс» у Магілёве, прысвечанае дыверсіфікацыі экспарту. Мы вызначылі, што для атрымання доступу на рынак Еўрапейскага саюза беларускім прадпрыемствам трэба паляпшаць маркетынгавую і кіраўніцкую палітыку, павышаць сваю канкурэнтаздольнасць. Дзіўна, што большасць сайтаў беларускіх прадпрыемстваў у англамоўным варыянце не дае неабходную інфармацыю аб экспартуемай прадукцыі. Адсутнічаюць універсальныя спецыялісты, здольныя прасоўваць тавар на знешнія рынкі.

І яшчэ. Нарошчванне долі беларускіх таваравытворцаў на рынку Еўразійскага эканамічнага саюза стрымліваецца пераважна нетарыфнымі абмежаваннямі: адміністрацыйнымі (сертыфікаты, ліцэнзіі) і тэхнічнымі (маркіроўка, ветэрынарны кантроль, стандарты якасці). Мяркуем, што адказным органам выканаўчай улады (МЗС, Мінэканомікі, галіновыя міністэрствы) неабходна больш актыўна абараняць нацыянальныя інтарэсы ў інтэграцыйных структурах, дамагацца роўных умоў працы для ўсіх суб'ектаў гаспадарання.

— Што датычыцца інфарматызацыі, то пад яе знакам, здаецца, прайшоў увесь 2018 год.

— І недарэмна. Пашырэнне спектру і аб'ёмаў работ у IT-сферы — гэта дадатковая валютная выручка, новыя рабочыя месцы з высокай дабаўленай вартасцю і, у цэлым, развіццё сферы паслуг з нізкай матэрыялаі энергаёмістасцю. Таму мэтавай задачай парламентарыяў з'яўляецца садзейнічанне ў пазіцыянаванні Беларусі як IT-краіны і стварэнне прававой базы для лічбавізацыі эканомікі.

ТЭХНАЛОГІІ

Першыя рэзідэнты тэхнапарка «Горкі» ствараюць

www.gorkiv.by

Старшыня райвыканкама Сяргей КУЛАГІН і дырэктар тэхнапарка Андрэй ЦІМАЕЎ з новымі рэзідэнтамі.

Экспертны савет тэхнапарка «Горкі» разгледзеў бізнес-праекты і прыняў рашэнне аб рэгістрацыі сваіх першых рэзідэнтаў, якія спецыялізуюцца на дакладным земляробстве і жывёлагадоўлі. Гэта ТАА «Навукова-тэхнічны цэнтр «БелАграРобат» (Горкі, Масква) і прыватнае прадпрыемства «Размеркаваныя сэнсарныя сістэмы» (Мінск), паведамляе «Горацкі веснік».

— Гэта знамянальны дзень для Горацкага рэгіёна, які заўсёды адкрыты для рэалізацыі інавацыйных інвестыцыйных праектаў, усяго новага і перадавога, — адзначыў **старшыня райвыканкама Сяргей КУЛАГІН.** — Сёння тэхнапарк «Горкі» выйшаў на новы ўзровень сваёй работы. Для эканомікі раёна з'яўленне першых рэзідэнтаў мае вялікае значэнне.

Варта адзначыць, што, акрамя стварэння цэнтраў распрацовак, рэзідэнты плануюць асвоіць вытворчасць у Горацкім раёне. А гэта новыя рабочыя месцы. Праз іх прыйдуць іншыя інвестары. Прыемна, што на паўночны ўсход Беларусі, мэтанакіравана прыехалі сталічныя прадпрымальнікі для навуковага ўдасканалення сваіх распрацовак у дакладным земляробстве і жывёлагадоўлі. Тут будуць іх укараняць у сельгаспрадпрыемствах раёна, каб знізіць выдаткі і распаўсюджваць вопыт на суседнія рэгіёны.

На думку **дырэктара ТАА «Тэхнапарк «Горкі» Андрэя ЦІМАЕВА,** падзея